УДК 821.161.09(092)

# ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА Ў ТВОРЧАСЦІ М. ГАРЭЦКАГА І К. ЧОРНАГА

**А. У. Ярмоленка**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: ermolenko80@tut.by*

У артыкуле даследавана наватарства М. Гарэцкага і К. Чорнага ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя, якое заключаецца праўдзівым натуралістычным адюстраванні падзей вайны і іх уплыву на псіхіку чалавека. Асветлены асаблівасці паэтыкі пісьменнікаў, такія як псіхааналіз, асэнсаванне сну і плыні свядомасці герояў. Прааналізавана праблематыка творчасці М. Гарэцкага і К. Чорнага, выяўленая ў асэнсаванні дэгуманізацыі грамадства, крызіса традыцыйных маральных каштоўнасцей.

*Ключавыя словы:* Першая сусветная вайна; селянін; псіхіка; самасвядомасць;натуралізм; псіхалагізм.

Першая сусветная вайна з’явілася катаклізмам не толькі з пункту гледжання сусветнай гісторыі, але і для літаратурнага свету, беларускай літаратуры ў тым ліку. Надзвычайная жорсткасць вайны прывяла да з’яўлення паэзіі і прозы пра яе падзеі і наступствы, якія адлюстраваны ў творчасці непасрэдных удзельнікаў вайны і пісьменнікаў міжваеннага перыяду XX стагоддзя. Катастрафічнае ўздзеянне Першай сусветнай вайны на жыццё беларускага народа знайшло сваё асвятленне ў творах М. Гарэцкага і К. Чорнага. Даследаванне творчасці пісьменнкаў дазволіць выявіць уплыў вайны на тэматыку і праблематыку айчыннай літаратуры, асэнсаваць асаблівасці паэтыкі ваеннай прозы М. Гарэцкага і К. Чорнага, якая патрабуе сучаснага літаратуразнаўчага аналізу.

Трэба адзначыць, што вывучэнне тэмы Першай сусветнай вайны ў творчасці М. Гарэцкага і К. Чорнага, па аб’ектыўных прычынах, атрымала сваю распрацоўку пераважна ў пачатку XXI стагоддзя. У беларускім літаратуразнастве тэме вайны ў творах пісьменнікаў прысвечаны навуковыя артыкулы (В. У. Азарка «Роля хранатопу ў раскрыцці ідэі апавядання “Літоўскі хутарок”» [1], А. М. Мельнікава. «Першая сусветная вайна праз прызму твораў М. Гарэцкага і Кузьмы Чорнага» [2], Т. Н. Тарасава «Вобраз беларуса-бежанца Першай сусветнай вайны ў творах Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Гніламёдава» [3]), радзелы дысертацый (А. М. Мельнікава

«Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя» [4]) і манаграфій (М. А. Тычына «Народ і вайна: адлюстраванне Першай сусветнай вайны у беларускай літаратуры» [5]).

Адным з першых беларускіх пісьменнікаў, у творчасці якога знайшлі адлюстраванне падзеі Першай сусветнай вайны, быў М. Гарэцкі. Новая для беларускай літаратуры тэма вялікай народнай трагедыі патрабавала пошукаў адметнага падыходу да яе асвятлення. Асэнсоўваючы асабістыя ўражанні і назіранні, М. Гарэцкі, на думку сучасных даследчыкаў, сфарміраваў экзістэнцыяльны погляд на чалавека і свет. Т. М. Тарасава сцвярджае: «Глабальна асэнсоўваючы сітуацыю чалавека пачатку XX ст., выяўляючы найскладанейшую дыялектыку ўзаемаадносін людзей у свеце, эвалюцыю іх свядомасці, пісьменнік у рэчышчы еўрапейскага літаратурнага працэсу ўздымае праблему маральных меж, фармулюе канцэпцыю суадносін розуму і маралі, праблему грамадства без Бога. Назіранні, зробленыя М. Гарэцкім, раўназначныя адкрыццям у заходнееўрапейскай і рускай літаратурах М. Пруста, Ф. Кафкі, Р. Музіля, А. Белага, І. Буніна, У. Набокава і інш. Адметным бачаннем свету і чалавека ў ім, адчуваннем трагічнасці часу, стылёвай выразнасцю пісьменнік надаў беларускай прозе еўрапейскае аблічча. У яго творах знайшла ўвасабленне арыгінальная мадэль тыпалагічнага спалучэння еўрапейскага экзістэнцыялізму і рускага псіхалагізму, што дае падставы гаварыць пра своеасаблівы экзістэнцыяльны псіхалагізм пісьменніка» [6, с. 14].

У аповесці «Ціхая плынь» (1917-1930) М. Гарэцкі адлюстроўвае лёс простага беларускага селяніна Хомкі, яго барацьбу за выжыванне і смерць у час Першай сусветнай вайны. Аўтар пачынае аповесць з паказу жорсткіх умоў, у якіх павінны існаваць жыхары вёскі, прыгнёт і несправядлівасць, якія ім трэба выносіць, адстойваючы сваё права на жыццё. Пісьменнік падкрэслівае, што асноўным сродкам заробку мясцовага насельніцтва з'яўляецца перавозка спірту для бровара, які спрыяе распаўсюджанню п'янства і нястачы сярод сялян. У такіх невыносных сацыяльна-бытавых умовах вымушаны расці галоўны герой аповесці М. Гарэцкага. Яго гаротная гісторыя непарыўна звязана з гісторыяй вёскі, сацыяльна-палітычнымі падзеямі на тэрыторыі Беларусі пачатку XX стагоддзя.

Пісьменнік з горыччу канстатуе, што дзякуючы пакутлівым абставінам існавання вёскі, сялянскія дзеці з самага маленства павінны прывыкаць да самастойнасці і цяжкай працы на карысць сям'і і дзяржавы. Хомка, каб дапамагчы бацькам, вымушаны з дзяцінства займацца нялёгкай работай, вазіць спірт на бровар: «Спацькі б дый

спацькі пад цёплым кажухом, а трэба ехаць разам з бацькам, трэба цёпла абувацца, апранацца ды ісці на сцюжу дый садзіцца на чужыя сані (на сваіх, горшых, едзе бацька сам). Да бровару ад хаты блізка, і сцюжа, хоць дужа прыкрая маломy пасля цёплай хаты, нядоўга цягнецца, каля бровару можна пагрэцца. Тады – бровар. Шум, лаянка. Пояць коні. Яму трэба іх трымаць, пакуль бацька з мужчынамі ўскоціць па дошках на кожныя санкі па бочцы. А потым ехаць – далёка, нудна, у страшэнным холадзе» [7, с. 263].

Пісьменнік падрабязна апісвае, як адмоўныя бакі характару і шкодныя звычкі бацькі галоўнага героя ўплываюць на яго выхаванне і адукацыю: «Пад павеццю бацька выпівае, чамусьці адвярнуўшыся да сценкі, і трошку недапітага падносіць сыну. – “Пагрэйся, сынок, на дарогу”. – “Не хачу я”. – “Ну! Не дурэй!” – Хлопчык з агідаю дапівае. Ён цяпер ведае, што ўвечары бацька нап’ецца на станцыі, дамоў нічога не прывязуць, бо нічога не заробяць пасля той выпіўкі. Бацька будзе злосны, будзе крычаць, біць коні» [7, с. 273].

П’янства, беднасць і дрэнная рэпутацыя бацькі не толькі не спрыяюць сацыялізацыі сына, але і прыводзяць да трагічнай развязкі. Без бацькоўскай падтрымкі Хомка застаецца сам-насам са сваім лёсам, вымушаны змагацца не толькі з неспрыяльнымі і нават гібельнымі сацыяльна-бытавымі ўмовамі, але і з адмоўным уплывам самага блізкага яму чалавека, які павінен клапаціцца і абараняць уласнае дзіця. Запалоханага хлопчыка выганяюць са школы, і ён разам з бацькам вымушаны выконваць работу дарослага чалавека. Такім чынам адбываецца выхаванне і адукацыя Хомкі ў школе жыцця. Рана пасталеўшы, герой аповесці не бачыць у навакольным свеце нічога, акрамя штодзённай цяжкай працы, холада і п’янства, грубай лаянкі і несправядлівасці.

З-за недагляду бацькі Хомку забіраюць у войска за два гады да вызначанага тэрміну, і юнак трапляе ў пекла ваенных падзей. Аўтар выразна адлюстроўвае надзеі і мары маладога чалавека, якія перапыняе вайна. Хомка толькі пачынае працаваць парабкам у добрага гаспадара, атрымліваць грошы, марыць аб каханні і стварэнні сям’і. Замест гэтага ён аказваецца ўцягнутым у крывавую драму забойства людзей, сэнсу якой не разумее: «Хомку не спалася. Дождж аднастайна, ціха і прыемна, безупынку шуршэў па страсе, зрэдку пыхала нядужая бліскаўка, і шугаў рабінаю вецер. Вада сцякала цурочкамі і бурбоніла ў падстаўленую маткаю даёнку. І Хомка слухаў, слухаў – і думаў. Ён меўся абмеркаваць усё з усіх бакоў, усё ўцяміць, што і як… І сам не ведаў: жаль яму ці не?» [7, с. 292].

Не разумее галоўны герой і бессэнсоўнай муштры, грубай лаянкі камандзіраў у войску, доўгіх знясільваючых пераходаў па незнаёмай мясцовасці: «Хомка знямогся і ледзь пераступаў нагамі. На прывалах ён валіўся на памоклае лісцё, як забіты, і каб не ласкава-насмешлівы покрык і лёгкі выспятак таварышаў, ён бы не ўзняўся. Хомка меўся абмеркаваць усё з усіх бакоў, усё ўцяміць, што і як, што і як… жаль яму ці не?» [7, с. 295]. Пісьменнік адлюстроўвае дакучлівую думку героя, якая зноў і зноў вяртаецца да спрадвечнага пытання аб магчымасці прымірэння асобы з пакутлівымі выпрабаваннямі і несправядлівасцю лёсу.

Аўтар неаднаразова адзначае, што нікога не клапоціць жыццё Хомкі. Няма ніводнага чалавека, які пашкадаваў бы яго, хоць словам спачування суцешыў і падтрымаў героя. Ён застаецца зусім адзін перад жыццёвым катаклізмам, экзістэнцыяльнай сітуацыяй, у якой чалавечае жыццё нічога не каштуе. Пісьменнік стварае выразны малюнак вайны, дзе герой жыве і дзейнічае ва ўмовах пастаяннай небяспекі. У такіх умовах асабліва абвастраецца асэнсаванне пытанняў жыцця і смерці. Упершыню ў беларускай літаратуры пісьменнік даследуе наступствы разбуральнага ўздзеяння ваенных падзей на псіхіку чалавека, выкарыстоўваючы такія мадэрнісцкія прыёмы, як натуралізм у апісаннях і псіхааналіз.

Знакавым для разумення наступстваў уздзеяння падзей вайны на свядомасць героя з'яўляецца сон Хомкі аб забойстве авечкі. Авечку рэжуць на свята, але яна аказваецца акотная, забіваюць не толькі яе, але маленькіх ненароджаных ягнят. Бязвінныя ахвяры, яны сімвалізуюць маладых салдат, якія не паспелі спазнаць жыцця і будуць забіты: «Бацька дастае з нейкім пузыром разам і выкладае на зямлю, дужа асцярожненька, парачку слізенькіх ягнятак. У іх чорная, прыгожая, як у паноў на каўнярах, кароценькая, курчавая шэрстачка. І дужа вялікія, буйныя галоўкі. Разглядаюць іх, і бацька кажа: "Бараны былі б не шкода!"» [7, с. 297]. Як бацьку не шкада ягнят, так і на вайне не шкадуюць салдат, якія як скаціна павінны пакорліва ісці на смерць. Нездарма аўтар паўтарае фразу пра бараноў, якіх не трэба шкадаваць: «Што вы, братцы, разлягліся спаць, як бараны? жыцця не шкода? – кажа трывожным голасам узводны, будзячы і выга-няючы ўсіх людзей з зямлянкі. – У госці вы прыйшлі, ці што? Бяжы хутчэй у акопы… Немец наступае!» [7, с. 297].

Адным з першых у беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя М. Гарэцкі засяроджвае ўвагу на плыні думак і пачуццяў героя, адлюстроўвае сны і падсвядомыя жаданні пратаганіста. Апісанні пісьменніка сведчыць аб фарміраванні і развіцці самасвядомасці

новага героя. Героі пісьменніка перажываюць гістарычны працэс, падзеі часу як частку свайго мікракосму, сваё духоўнае развіццё. Гарэцкі адлюстроўвае лёс краіны і свету праз супярэчлівыя перажыванні асобы, далучанай да гістарычнага працэсу, асэнсоўвае варожасць навакольнай прасторы, адзіноту і пакінутасць у чужым свеце. Аўтар канстатуе каштоўнасць чалавечай асобы, яе унікальнасць, малюе своеасаблівы духоўны свет простага чалавека, якому адмаўляюць у здольнасці думаць і адчуваць.

Каштоўнасць асобы сцвярджае і К. Чорны ў рамане «Бацькаўшчына» (1931). У нястачы і галечы праходзіць дзяцінства аднаго з галоўных герояў твора пісьменніка Адася Гушкі. З самых ранніх гадоў, каб зарабіць сабе на хлеб і падтрымаць сям'ю, ён вымушаны працаваць парабкам ў чужых людзей. Нягледзячы на цяжкую працу членаў сям'і, бацькі героя не маюць ні ўласнага дома, ні кавалка зямлі. Толькі з міласці пана бацька Адася ставіць хату на камяністым надзеле, з якога яго ў любы момант могуць прагнаць. На працягу дзеяння твора галоўнай марай сям'і з'яўляецца набыццё уласнага кавалака зямлі. З мэтай здабыць грошы на першы ўзнос на зямельны надзел бацька героя Леапольд Гушка прадае ўсё да апошняй міскі з хаты. Сімвалам беднасці выступае спустошаны дом, у які прыходзіць на пабыўку Адась Гушка. Ён бачыць там гаротную маці і голыя сцены хаты, у якой вырас: «Чамусьці яна ўстала і падалася глянуць у хату. Там былі сапраўды пустыя сцены. Яна, як аслупянелая, стаяла некалькі хвілін, пасля не вытрымала жаночае сэрца: вельмі горна было жанчыне ў пустой, у голай хаце пасля Німіравых слоў, пасля таго як Адаська нешта стаў маўклівы адразу» [8, с. 320].

Каб набыць жаданую зямлю, Леапольд Гушка з сям'ёй прымае расійскае грамадзянства. Такое рашэнне карэнным чынам змяняе лёс яго сына Адася. Ён, атрымаўшы падданства, адразу становіцца ваеннаабавязаным і з пачаткам ваенных падзей трапляе на вайну. К. Чорны ў апісанні ваенных падзей прытрымліваецца традыцыі, закладзенай М. Гарэцкім. Ён асэнсоўвае вайну як крывавую бойню, на якую гоняць простых рабочых і сялян з двух супрацьлеглых ваюючых бакоў: «Натоўп маўчаў. Пахла ўжо крывёю, жывым мясам з-пад гармат. Натоўп стаяў. Гэта быў малюнак таго дня па ўсёй Еўропе. Народы стаялі. Стаяў расійскі народ. Стаялі іншыя народы, з'едненыя абцугамі пад сцягам Расійскай імперыі. Іх гналі заваяваць сабе старое права: з жабрачымі торбамі на плячах дагніць свій век у вялікай турме і перадаць гэтае права сваім дзецям» [8, с. 340].

Вайна не абараняе інтарэсы бяднейшых слаёў насельніцтва, сцвярджае ў рамане «Бацькаўшчына» К. Чорны. Сялянам няма чаго

губляць акрамя штодзённай цяжкай працы, голаду і нястачы. Таму салдаты добраахвотна здаюцца ў плен, нягледзячы на смяротную небяспеку і ганьбу здрадніцтва: «Дык перад страшным боем, чакаючы яго, як займалася на дзень, у прытульным кутку, паміж хмызнякоў, шэрая постаць старалася, каб як мага шчыльней дапасціся да зямлі. Чалавек стараўся, каб хутчэй выбрацца з абсягу вачэй, што маглі бачыць яго адтуль, адкуль ён выпаўз. Ён поўз вельмі паволі, пакуль не адпоўз далёка. А тады ўжо дастаў з кішэні белую хусцінку, усчапіў на адкручаны ад стрэльбы штык (стрэльба асталася недзе ў акопах. З якой радасцю пакінуў яе там чалавек!) і з гэтым імправізаваным белым сцягам цяпер пабег сагнуўшыся» [8, с. 341].

К. Чорны асэнсоўвае станаўленне самасвядомасці селяніна, адкрывае свет яго думак і пачуццяў, аналізуе псіхалагічныя працэсы ў экзістэнцыяльнай сітуацыі. Перад тварам смерці просты чалавека пачынае супастаўляць падзеі і факты, усведамляе свае мэты і інтарэсы, пачынае змагацца за выжыванне. Пісьменнік расказвае пра расчараванне ў прапагандуемых ідэях: цар, Бог, імперыя, за якія прапануюць паміраць у час вайны. Аўтар адлюстроўвае масавыя выпадкі дэзерцірства, якія заканамерным чынам вынікаюць з супраціўлення навязаным прапагандай ідэалам: «Можа, яно і нядобра я зрабіў, але – чорт яго бяры з усім. Унь мая сям’я жыве ля самай пазіцыі, не сёння, дык заўтра, можа, немец зойме. А я што, адзін буду аставацца ад сям’і? Хоць палонныя дзеці бацьку пры сабе мець будуць» [8, с. 347].

Такім чынам, працягваючы традыцыю М. Гарэцкага, К. Чорны асэнсоўвае ў рамане «Бацькаўшчана» духоўнае жыццё асобы, рост і развіццё чалавечай свядомасці. Найважнейшым у рамане з’яўляецца праблематызацыя і выяўленне ўнутраных пошукаў Леапольда і Адася Гушкі. У неспрыяльных умовах існавання, на мяжы жыцця і смерці адбываецца спасціжэнне чалавекам свету і сябе самога. Катастрафічныя падзеі вайны даюць імпульс для думак, матывацыі ўчынкаў персанажаў, змен у свядомасці і жыццёвых пазіцыях герояў. Канфлікт ў рамане выяўляюцца непасрэдна праз унутраную падзейнасць: спачатку аўтар адлюстроўвае ўспрыняцце героямі падзей і фактаў рэчаіснасці, а потым асэнсоўвае іх эмоцыі, успаміны, думкі і, нарэшце, пераасэнсаванне, новае стаўленне да сябе і навакольнага асяроддзя.

Ваенныя падзеі, па сцвярджэнню М. Гарэцкага і К. Чорнага нясуць разбуральны патэнцыял для псіхікі селяніна. Селянін, прызначэннем якога з’яўляецца падтрыманне жыцця, вымушаны ісці ў салдаты і забіваць людзей. Просты чалавек, які заўсёды жыў па традыцыйных

нормах маралі, не разумее сэнсу забойства такіх жа працаўнікоў зямлі як і ён. Героі пісьменнікаў, пераасэнсаваўшы ўласнае стаўленне да каштоўнасцей і ідэалаў эпохі, адмаўляюцца прыняць асноўныя законы ваеннага часу – жорсткасць і бесчалавечнасць. Яны не хочуць удзельнічаць у бессэнсоўным забойстве сабе падобных. Таму выхадам з экзістэнцыяльнай сітуацыі пісьменнікі лічаць смерць, плен ці дэзерцірства, якія, нягледзячы на катастрафічныя наступствы, супрацьстаяць маральнаму нігілізму ўлад.

Наватарствам М. Гарэцкага і К. Чорнага з'яўляецца праўдзівае натуралістычнае адюстраванне падзей вайны і іх уплыву на псіхіку простага чалавека. Пісьменнікі аналізуюць падсвядомыя глыбіні душы герояў, выкарыстоўваючы псіхааналіз, асэнсаванне сну і плыні свядомасці герояў, Спалучаючы найлепшыя здабыткі тагачаснай сусветнай літаратуры з традыцыямі рэалістычнай беларускай прозы М. Гарэцкі і К. Чорны ўздымаюць праблему дэгуманізацыі грамадства, крызісу традыцыйных маральных каштоўнасцей.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Азарка, В. У. Роля хранатопу ў раскрыцці ідэі апавядання "Літоўскі хутарок" [Электронны рэсурс] / В.У. Азарка // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : мат. Міжнар. навук. канф. (Мінск, 7-8 кастрычніка 2014 г.) / прадм. і ўклад. С. Л. Гараніна ; навук. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – 2014. – Рэжым доступу : http://elib.bspu.by/handle/doc/3428. – Дата доступу : 26.02.2021.

2. Мельнікава, А. М. Першая сусветная вайна праз прызму твораў М. Гарэцкага і Кузьмы Чорнага // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7–8 кастрычніка 2014 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2014. – С. 155–159.

3. Тарасава, Т. Н. Вобраз беларуса-бежанца Першай сусветнай вайны ў творах Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Гніламёдава [Электронны рэсурс] / Т. Н. Тарасава // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : мат. Міжнар. навук. канф. (Мінск, 7-8 кастрычніка 2014 г.) / прадм. і ўклад. С. Л. Гараніна ; навук. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – 2014. – Рэжым доступу : http://elib.bspu.by/handle/doc/3428. – Дата доступу : 26.02.2021.

4. Мельнікава, А. М. Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя : аўтарэф. дыс. ... доктара філал. навук : 10.01.01 / Мельнікава Анжэла Мікалаеўна ; Нацыянальная академія навук Беларусі. - Мінск, 2017. - 50 с.

5. Тычына, М. А. Народ і вайна / М.А. Тычына. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 433 с.

6. Тарасава, Т. М. Беларуская проза XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратуным кантэксце : экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя : аўтарэф. дыс. ... докт. філал. навук : 10.01.01 / Т. М. Тарасава ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі,

цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. – Мінск, 2013. – 44 с.
7. Гарэцкі, М. Выбраныя творы / Максім Гарэцкі; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб, прадм. і камент. Т. Голуб. – Мінск : Кніга збор, 2009. – 640 с.
8. Чорны, К. Збор твораў, у 8 тамах, Т. 4 : Аповесці і раманы / К. Чорны. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. – 496 с.

## THE FIRST WORLD WAR IN THE WORKS OF M. HARETSKY AND K. CHORNY

**A.U. Yarmolenka**
*Belarusian State University of Transport*
*Gomel, Belarus*
*E-mail: ermolenko80@tut.by*

The article analyzes the innovation of M. Haretsky and K. Chorny in the Belarusian literature of the early twentieth century, which is a true naturalistic reflection of the events of the war and their impact on the human psyche. The features of the poetics of writers, such as psychoanalysis, the interpretation of sleep and the flow of consciousness of the characters are highlighted. The problems of the work of M. Haretsky and K. Chorny, expressed in the understanding of the dehumanization of society, the crisis of traditional moral values, are comprehended.

*Keywords*: World War I; peasant; psyche; self-awareness, naturalism; psychologism.